Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 34 (204)

# ВЯЛІКІ СЕЗОН
## Сёлета ў Беларусі з'явіцца ўласны міжнародны конкурс вакалістаў

**Пра гэта паведаміў дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Уладзімір Грыдзюшка на пачатку новага тэатральнага сезона. Такім чынам тэатр збіраецца ўмацоўваць імідж Мінска як «опернай сталіцы СНД», паводле слоў дырэктара. Конкурс плануюць правесці падчас Каляднага опернага форуму, які стаў традыцыйным.**

З іншых традыцый — працяг практыкі абменных гастроляў: сёлета будзе магчымасць пабачыць Львоўскую оперу ў Мінску.

Для сваіх гледачоў Вялікі тэатр рыхтуе 13 прэм'ер у новым сезоне. Акрамя нацыянальнага балета «Вітаўт», чакаецца працяг спектакляў нацыянальнай оперы: «Гальку» Станіслава Манюшкі на малой сцэне пастаўіць Міхаіл Панджавідзэ. Гэтую ж оперу збіраюцца паказаць падчас «Вечароў Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў».

Будуць адзначаны спектаклямі 2 юбілеі: «Рыгалета» Вердзі і «Лятучы галандзец» Вагнера. З рускай класікі з'явіцца ў афішы «Пікавая дама» Чайкоўскага. Ужо ў верасні ў камернай зале імя Л. Александроўскай можна будзе паслухаць «Дырэктар тэатра» Моцарта і «Спачатку музыка, потым словы» Сальеры.

З балетных прэм'ер, якія чакаюцца ў новым сезоне, ці не самую вялікую ўвагу прыцягнуць «Шэсць танцаў» сусветна вядомага пастаноўшчыка Іржы Кіліяна. Захапленне магіяй лічбаў прадоўжыцца ў балеце «Сем прыгажунь» азербайджанскага кампазітара Кара Караева. Але пасля — якраз дарэчы падумаць пра «Сем смяротных грахоў» (беларускага кампазітара Алега Хадоскі), які рыхтуецца на малой сцэне для прыхільнікаў сучаснай харэаграфіі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ Выставы

# ЗМРОК — ГЭТА НЕ ТАК І СТРАШНА
## Даказвае скульптар Уладзімір Лапо

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску працуе выстава скульптара, мастака, вандроўніка і беларуса з брытанскім грамадзянствам Уладзіміра Лапо. Праект прэзентуе творы графікі розных гадоў і скульптуры, выкананыя ў тэхналогіі «direct cast» — прамога ліцця. Гэтая тэхналогія была вядома яшчэ ў Сярэднявеччы, вядомым нам як «змрочны час». Што, зрэшты, часткова і тлумачыць назву выставы. Але змрок як з'яву аўтар спрабуе разгледзець і з іншых, больш станоўчых ракурсаў.**

Метад прамога ліцця адмаўляе мадэляванне, любое папярэдняе стварэнне працоўнай копіі на карысць рэальнага аб'екта. Гэта дадае пэўны элемент выпадковасці, спантаннасці ў стварэнні мастацкага твора, прымушае меру асабістага ўмяшальніцтва аўтара дамінаваць.

Уладзіміра Лапо часта называюць прадстаўніком маргінальнай культуры. І, па сутнасці, выстава «Крок у змрок» з'яўляецца пэўнай квінтэсенцыяй даследавання душы маргінальнага чалавека, які, як гуміляўскі «пасіянары», у прынцыпе, і кіруе гэтым светам. Прынамсі здаецца, што філасофія мастака яшчэ і ў тым, што якраз маргінальная культура кіруе светам. Уладзімір Лапо — творчая асоба, чыя мастацкая дзейнасць выходзіць за рамкі агульнапрынятых стыляў і кірункаў. Мастак, графік, скульптар, стваральнік інсталяцый, літаратар у адной асобе, ён увасабляе сабой кропку дотыку дэструктыўнага і творчага працэсаў, рэальнасці і выдумкі, мастацкай і аб'ектыўнай рэчаіснасці.

Яго графіка і скульптуры наўмысна неахайныя. У прынцыпе, яны нават здольныя адштурхнуць. Але менавіта гэтая абарончая рэакцыя перад нечым незнаёмым, змрочным і цьмяным якраз і прымушае задумацца. Што гэта за свет, у якім мы жывём? Хто ўсе гэтыя людзі? Чаму яны такія злыя альбо незадаволеныя? Альбо, наадварот, сытыя, добрыя і задаволеныя, што бывае, безумоўна, значна радзей.

Уладзімір Лапо, як прадстаўнік маргінальнай культуры, знаходзіцца на памежжы асяродкаў, груп, сістэм, адчувае ўплыў іх супярэчных нормаў і каштоўнасцяў, пры гэтым канструе асабістую рэальнасць, крайнюю індывідуальнасць, што знаходзіць праяву ў ладзе жыцця, формах самавыяўлення, у метадах творчай дзейнасці.

Куратар выставы Наталля Паторская нездарма ўзгадвае вядомага амерыканскага сацыёлага Роберта Парка. Ён пісаў: «Такі чалавек няўхільна робіцца (у параўнанні з яго непасрэдным культурным асяроддзем) індывідам з больш шырокім гарызонтам, больш вытанчаным інтэлектам, больш незалежнымі поглядамі». Парк разумее маргінальную асобу, як безумоўна, станоўчы, канструктыўны элемент.

— Іншы сацыёлаг, Эверэт Стоўнквіст, разглядае маргінальнага чалавека як ключавую асобу (key-personality) у кантактах культур, — тлумачыць куратар. — Такое разуменне асобы ў поўнай меры можна аднесці да аўтара праекта — грамадзяніна свету.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# У КОЖНАГА СВОЙ «D.A.R.»
## Калі ніхто дакладна не ведае, але ўсе здагадваюцца

**У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» да 25 верасня працуе выстава жывапісу мастака і кампазітара Аляксея Хацкевіча, вядомага ў народзе як Хацон. Кірунак твораў, якія складаюць экспазіцыю, аўтар акрэслівае як дэкаратыўна-абстрактны рэалізм. І ўжо сам гэты аксюмаран настройвае на адпаведны іранічна-абсурдны, сцёбны стыль успрымання.**




Мастак як бы сцвярджае, што нішто ў гэтым свеце, па сутнасці, нічога не вартае. І кожны можа ўсё і не можа нічога абсалютна ў аднолькавай ступені. Але нават няздольнасць рабіць нешта — гэта таксама своеасаблівае ўменне. Словам, у кожнага на гэтай планеце ёсць свой «D.A.R.». Нездарма выстава называецца менавіта так.

Тэорыю адоранасці кожнага і каштоўнасці кожнага дару мастак падтрымлівае наступным эксперыментам: ён дапрацоўвае малюнкі сваёй маленькай дачкі, ператвараючы іх у аб'екты актуальнага мастацтва.

Гэты арт-мікс — своеасаблівы, хоць і не надта арыгінальны, выклік. Вядома, што дзіцячая творчасць, як і наогул любы наіў-арт, мае ў сабе велізарны мастацкі патэнцыял, свежы погляд, «зарад бадзёрасці» для стомленых ад творчых пошукаў мастакоў. Аляксей Хацкевіч, робячы сваю дачку суаўтарам, нібыта прамаўляе: ніхто не горшы і не лепшы за іншых, а ўсё геніяльнае, як вядома, надзвычай простае па сваёй сутнасці.

Праект Хацона пра тое, што ніхто дакладна нічога не ведае, але ўсе здагадваюцца, хіхікаюць і пераміргваюцца. Мастацтва!

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Прэм'ера

# КАВАРСТВА І КАХАННЕ: АЙЧЫННЫ ВАРЫЯНТ
## У чым Вітаўт абышоў Ягайлу?

**Браты як браты — гулялі разам, сілаю мераліся, забаўляліся. Жартачкі скончыліся са смерцю Кейстута.**
**І хто ведае, як там было насамрэч: ці то чорны чалавек нейкі спакусай улады заразіў, ці то сваё чорнае кожны сам у сабе песціць. А мо ўсё і не так было?.. Аднак смерць бацькі Кейстута зрабіла Вітаўта моцным і непераможным. А яго стрыечны брат Ягайла знайшоў сябе ў іншай краіне...**





Яшчэ з моманту прэм'еры балета «Страсці» (пра Рагнеду) стала зразумела: гісторыя — вялікая тэма, якая можа быць асновай для нацыянальнага балета. Можа быць... І стала зноў: у гэтыя дні актыўна абмяркоўваюць прэм'еру балета «Вітаўт» кампазітара Вячаслава Кузняцова ў пастаноўцы Юрыя Траяна, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком балетнай трупы Вялікага тэатра Беларусі.

### Балет і патрыятызм

Гісторыю сваёй краіны сорамна не ведаць. Але колькі яе ні вывучай — заўсёды застаецца нешта, што можна адкрываць, адкрываць. І колькі ні гавары пра гісторыю — усё мала, усё роўна застаецца нехта, для каго гэта будзе ўпершыню. І ўсё роўна будуць тыя, хто захоча яшчэ і яшчэ.

Так было, напрыклад, калі ішоў у Купалаўскім тэатры спектакль «Князь Вітаўт». Ішоў доўга. Меў сваіх прыхільнікаў. Але нават калі спектакль аджыў сваё, былі тыя, хто засумаваў без Вітаўта. Без рэальнага героя. Не столькі без героя мастацкага твора (спектакля). І вось чарговая перамога нашага героя Вітаўта над забыццём: балетны варыянт. Балет, як і спектакль, звяртаецца да драматычных падзей смерці Кейстута і супрацьстаяння двух стрыечных братоў, якія прэтэндавалі на ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Што тут казаць: каб увасобіць на сцэне гэтых двух герояў, былі задзейнічаны лепшыя артыстычныя сілы. Тут цяжка паспрачацца з Юрыем Траянам, што ёсць каму ў нашай трупе ўвасабляць Вітаўта: на партыю прызначаны Ягор Азаркевіч, Антон Краўчанка, Ігар Аношка. І тыя, хто антыпода Ягайлу танцаваць могуць, ёсць: Алег Яромкін і той жа Ягор Азаркевіч. Ёсць каго і што танцаваць — паводле гісторыі. Але ключавое слова тут — «танцаваць». Харэаграфія нацыянальнага балета павінна быць адметнай, а пастаноўка выглядаць эфектнай, ствараць уражанне драмы, якая чалавека зрабіла асобай...

Што да эфектаў, то з імі ўсё ў парадку: святло, гульня колераў, дым, галава з рагамі над сцэнай, чырвонае полымя вогнішча. Сутнасць драмы вынікае з сюжэтнай лініі (калі хто ведае гісторыю) ды яшчэ з праграмкі (бо інакш цяжка разабрацца ў тым, што адбываецца) . Што ж да лініі харэаграфіі — яна таксама з нечага вынікае: з гісторыі развіцця беларускага балета ў апошнія дзесяцігоддзі…

Але так хочацца, каб гісторыя яго развіцця працягвалася, бо балет — мастацтва, якое без слоў можа пераварочваць душу (і мы ж бачылі, як гэта бывае!). І цяпер нам прапануюць новыя балетныя спектаклі, ці назвы ў афішу… Вельмі добрыя назвы: «Вітаўт» — гучыць з гонарам.

Між іншым, балет «Вітаўт» і глядзець можна з гонарам. Яго адчуюць тыя, для каго гісторыя вышэй за харэаграфію, а пачуццё патрыятызму вышэй за мэту тэатра пераварочваць душу. Тут яно, бадай, і пануе: наша гісторыя, наша трупа, наш тэатр... Слова «наш», безумоўна, саграває, гэтак жа, як свая кашуля. Але бываюць моманты, калі думаеш яшчэ і пра якасць кашулі. А добрая якасць можа найлепш падмацаваць пачуццё патрыятызму: сваё любіць больш прыемна тады, калі яно на ўзроўні...

Тым не менш, глеба для патрыятызму ёсць: не толькі з-за самога героя, падоранага нам гісторыяй. Яшчэ адным героем балета з'яўляецца музыка да яго. І гэта для мяне было самае галоўнае: у музыцы ёсць глыбіня, засяроджанасць, разважлівасць, ёсць і экспрэсія, і напружанне, сум і надзея. Яна распавядае і нараджае вобразы, якія кожны можа ўявіць сам і суаднесці з тым, што бачыць на сцэне. Музыка — дзіўнае мастацтва, якое можа праз гукі і мелодыі даць «убачыць» і эпохі, і народы з іх асаблівым светаадчуваннем. Можа мінулае злучыць з сучаснасцю: яно ж прарастае ў нас, таму і адгукаецца, рэзаніруе.

**Дырыжор-пастаноўшчык Вячаслаў ВОЛІЧ:**

*— У гэтым спектаклі няма ніводнай цытаты. Шмат аналогій, і ўсё выдатныя імёны прыходзяць на думку: Бартак, Пракоф'еў, Стравінскі. Але гэта арыгінальны твор кампазітара Вячаслава Кузняцова. Кампазітар вельмі тэатральны. Ён добра перадае атмасферу часу і адчувае драматургічны пульс. Мы запісалі гэты твор у аркестры паўтара года таму, тэатр пайшоў на такі эксперымент. Мне прыемна, што не было розначытанняў падчас працы над спектаклем.*



Што ж тады ёсць чалавек, творца, які ўмее ствараць такую музыку, у якой чуеш больш, чым гэта дазваляе сюжэт, нават з рэальнымі гістарычнымі персанажамі? Вячаслаў Кузняцоў падчас стварэння балета «Вітаўт» перанёс інфаркт, але аднавіўся. І прапаноўвае аднавіцца — праз музыку — іншым. Добра, што ёсць такая магчымасць — слухаць беларускую музыку ў Вялікім тэатры...

### Музыка і светаадчуванне



З аўтарам музыкі, **кампазітарам, прафесарам Вячаславам КУЗНЯЦОВЫМ** захацелася паразмаўляць пасля прэм'еры.

**— Гэта ўжо не першы балет на гістарычную тэму, да якога вы напісалі музыку...**

— Так, раней былі «Макбет» і «Клеапатра». На жаль, не паставілі. Мяне гісторыя натхняе. Папершае, заўсёды можна ўявіць сябе там. Напрыклад, у Егіпце: уявіў піраміды — і нібыта перанёсся туды, стаў часткай таго свету... У выпадку з «Вітаўтам» таксама дапамагала працаваць уяўленне. Уяўляў сябе спачатку ў лясах Вялікага Княства Літоўскага, потым у замку Кейстута. Далей — у Кракаве, дзе пануе бляск. Адсюль і адчуванне сутыкнення двух сусветаў. Але ж гэтае адчуванне можа быць у любую эпоху: калі сутыкаюцца розныя каштоўнасці і маральныя сістэмы. У гэтым сэнсе для мяне гэта філасофскі спектакль. Хоць героі належаць сёння розным краінам, але ж сутнасць супрацьстаяння не ў гэтым. Гэтыя героі належаць адначасова свету. Напрыклад, гісторыя Спартака ці сюжэт «Рамэа і Джульеты» даўно выйшлі за рамкі адной культуры. Гэта гісторыя агульначалавечая.

**— Напэўна, немагчыма пісаць музыку пра тых, каго ты не прыняў ці не палюбіў?**

— Героі гэтага балета вельмі яркія. Вітаўт жа — воін! Прычым калі я ўбачыў галоўных выканаўцаў роляў, то я зразумеў: усе Вітаўты! Артысткі, якія танцуюць Ганну, — усе трапяткія. Ядвіга — валявая, з характарам. А якія Ягайлы! Таксама з характарам, хоць гэты вобраз больш цёмны. Але яны з Вітаўтам браты. Бывае такое, што адзін брат хуліган, а другі — выдатнік. Мы пастараліся ўсе вобразы зрабіць вельмі рэльефнымі: калі кахаць, то так, што на разрыў нерву. Калі біцца — то насмерць.

**— Ці вывучалі вы тую эпоху, пра якую збіраліся пісаць музыку?**

— Так, але, хоць ёсць гісторыя, нам усё ж цяжка пранікнуць туды, каб адчуць, што там было і як. Мы можам здагадвацца пра тыя пачуцці, якія кіравалі людзьмі. Таму справа ва ўражанні. І ў музычным таксама. Я вось так адчуў. І калі я спрабую адкруціць назад амаль сем стагоддзяў, то ў мяне яны гучаць вось так. У іншага кампазітара яны будуць гучаць інакш, у трэцяга — у адпаведнасці з яго светаадчуваннем і ўспрыманнем гісторыі... Але справа не толькі ў гістарызме. Для мяне істотнай была гісторыя характараў, пачуццяў — тое вечнае, што важна для мастацтва. У якія вякі мы ні зазіралі б, мы іх лепш можам адчуць менавіта праз людзей, якія тады жылі, праз іх дзеянні, у аснове якіх — характар. Яго мы можам паказаць праз нейкія перажыванні, страсці. У нас аснова сюжэта, героі — гістарычныя. Але ж мы не ведаем дакладна, якія эмоцыі імі кіравалі ў якія моманты. Мы зрабілі варыянт: можа, вось такія... Але зноў-такі: нам так бачыцца з вышыні эпох.

**— Многія патэнцыйныя гледачы балета памятаюць спектакль «Князь Вітаўт» паводле п'есы Аляксея Дударава Купалаўскага тэатра. Вы яго глядзелі?**

— Не, не атрымалася. Але п'есу Дударава чытаў. Ён мне падараваў, падпісаў. Гэта і было першым крокам да стварэння балета. Прайшло ўсяго тры гады!.. Я выйшаў з Акадэміі музыкі, сустрэў Дударава. Паразмаўлялі. Потым ён патэлефанаваў мне, перадаў п'есу. Я пачытаў. Натхніўся. Вядома, стварэнне балета не было літаральным паводле п'есы. Той твор драматычны, але ў балеце няма слоў, а ёсць экспрэсія іншага кшталту, якая дапамагае гледачу разумець, што адбываецца. Таму дадаліся і з'явіліся чыста балетныя ідэі, якія б дапамаглі раскрыць сутнасць супрацьстаяння герояў Вітаўта і Ягайлы.

**— Вы як аўтар дапамагалі пастаноўшчыку? Таму што музыку кожны чуе па-свойму.**

— Вядома. Мы ўвесь час былі ў кантакце. Сустракаліся з пастаноўшчыкам Юрыем Траянам, з мастаком Эрнстам Гейдэбрэхтам (калі ён прыязджаў сюды з Германіі, дзе зараз жыве). З дырыжорам. З ранку да ночы я бываў на рэпетыцыях: прыходзілася нешта карэктаваць падчас працы. Адна справа — напісаць музыку. Але ж ёсць яшчэ артысты, якім танцаваць. Больш хуткі тэмп — для іх ужо ўсё мяняецца. Гэта мы глядзім балет і думаем: як прыгожа! А яны працуюць, вытрымліваюць каласальнае напружанне. Напрыклад, Адажыа не можа доўжыцца больш за пэўны час: артысты стамляюцца фізічна. А ў нас у балеце другое Адажыа вялікае. Імкнуліся скараціць, але самі выканаўцы сказалі: «Мы вытрымаем...»

**— Дагэтуль у афішы тэатра быў гістарычны беларускі балет «Страсці» Андрэя Мдзівані ў пастаноўцы Елізар'ева. Ці глядзелі вы яго?**

— Гадоў 15 таму. У мяне добрае ўражанне. Я адчуваю, што абавязкова знойдуць паралелі і ў харэаграфіі. Нічога страшнага. Мы так захапіліся працай, што вырашылі: зробім спектакль, а там ужо іншыя няхай мяркуюць. На тое і крытыкі... Але прафесіяналы (я спецыяльна запрашаў сваіх калег) бачаць прафесійныя хібы. А глядач павінен убачыць гісторыю. Ён не будзе думаць пра тое, як хто які жэст зрабіў. Калі гэта прабярэ, калі прымусіць скалануцца душу — значыць, сэнс ёсць.

**— Вас як аўтара можна павіншаваць, таму што кампазітар піша твор і далёка не заўсёды ўпэўнены, ці адбудзецца яго прэм'ера.**

— Так, у мяне ёсць шмат сачыненняў, якія я напісаў, а яны ляжаць. Вялікія, нават оперы. Прапанаваў, а мне кажуць: «Не наша тэма, пачакаем». Гэты спектакль мне прапанавалі. Тэатру спатрэбілася гістарычная тэма. Падабралася група: аўтар ідэі, добры мастак, пастаноўшчык. І была цудоўная трупа. Аркестр, дырыжоры. Заставалася ўсё злучыць. Што мы і рабілі.

**— Цудоўна, што другі сезон у Вялікім тэатры адкрываецца прэм'ерай твора беларускага кампазітара. Летась — операй Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда», сёлета — балет «Вітаўт». Але гэта адзінкі. Што трэба зрабіць для таго, каб гэта стала сістэмай і слухачы маглі знаёміцца з творамі сучасных беларускіх кампазітараў?**

— Я не хацеў бы, каб гэта вырашалася шляхам нейкага ўказання: маўляў, адзін балет ці опера на год... Але прыслухацца да кампазітараў трэба, калі яны прыносяць творы. Заказваць можна больш. Чаго ж пісаць «у стол»?.. Вось паглядзелі, што нейкі кампазітар цікава працуе: давайце яму закажам такую тэму, прапануем яму добрага лібрэтыста, мастака, створыцца каманда. І атрымаецца твор. Як у выпадку з «Вітаўтам»: гэта не столькі заказ, колькі выдатная прапанова. Гэта гонар для мяне...

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Кінакрокі

# БЕЛЫЯ РОСЫ, БЕЛЫЯ РОСЫ!
## На здымках фільма пра сямейныя каштоўнасці — атмасфера сямейная

**— Ой, як тут весела! — шапчу я фотакарэспандэнту на здымачнай пляцоўцы кінапраекта «Белыя росы-2». Толькі што мы наслухаліся развясёлых жартаў ад майстра па святле, які раіў нам «берагчы прычоскі», праносячы міма нейкае жудасна грувасткае абсталяванне. А пару хвілін таму мы былі перакананы, што пачаўся пажар, бо адмысловая «дыма-машына», як мы яе ахрысцілі, выпускала незлічоную колькасць густога белага дыму. Аказалася, што ён патрэбны для больш праўдападобнай імітацыі дзённага асвятлення, каб падкрэсліць праламленне святла. Пылінкі там розныя ў паветры лётаюць, ведаеце.**
**— Весела, але не ўсім, — з наўмысна суровым выглядам прамаўляе мужчына з рацыяй у руках і ў форме, больш падобнай на форму ваеннага ў «гарачай кропцы». Гэта начальнік пляцоўкі. Ён адказвае за тэхніку бяспекі і сочыць, каб на здымках усё ішло як трэба. Ён прыкрыквае на прысутных, калі яны перашкаджаюць рэжысёру працаваць. Словам, кіно пачынаецца са здымак.**

Насамрэч, цалкам верагодна, што назва ў фільма будзе зусім іншая. Але, прынамсі, аўтарам сцэнарыя будучай стужкі таксама з'яўляецца драматург Аляксей Дудараў. Роўна 30 гадоў таму ён напісаў сцэнарый для фільма «Белыя росы», які зняў рэжысёр Ігар Дабралюбаў. Напэўна, і сёння гэтая беларуская стужка ўзгадваецца ўсім нашым суайчыннікам, у якіх можна раптоўна запытацца пра любімы беларускі фільм.

«Белыя росы-2» нехта называе працягам фільма Дабралюбава, нехта — рымэйкам. Але стваральнікі сцвярджаюць, што гэта цалкам аўтаномны праект, падобны на славуты фільм хіба што дабрынёй і чысцінёй галоўнага пасылу. Ды і акцёры тут усе іншыя. З папярэдняга фільма ў гэты «перайшла» хіба што актрыса Ірына Ягорава. Вось і ўсё. Астатнія — новыя тыпажы, новыя твары. Юозас Будрайціс іграе Ходаса, Віктар Манаеў — суседа Ходаса Струка, Павел Харланчук іграе маладога і прабіўнога Бодзю, Яўгенія Жуковіч — закаханую ў Бодзю Паліну, аматарку прыроды і розных дзіўных рэчаў і з'яў. Таксама ў фільме задзейнічаны Ганна Палупанава, Андрэй Мярзлікін, Сяргей Жбанаў ды іншыя. Здымае фільм малады рэжысёр Аляксандра Бутар. Гэта яе дэбют у вялікім кіно. Да гэтага Аляксандра працавала на тэлебачанні ў Ягора Хрусталёва. Зрабіла шмат музычных кліпаў.

— Амаль уся беларуская эстрада прайшла праз нашы з Алегам рукі, — жартуе Аляксандра.

Алег — гэта аператар Алег Гірэль. І «Белыя росы-2» для яго таксама дэбют у вялікім кіно. Яны з рэжысёрам Аляксандрай Бутар шмат працавалі раней на іншых праектах і, наогул, сябруюць з сёмага класа школы. Дарэчы, тэлемюзікл «Паўлінка NEW» — таксама іх стварэнне.

Складана ацаніць, якім атрымаецца даволі амбіцыйны праект «Белыя росы-2», першапачаткова, увогуле, заяўлены на адкрытым рэспубліканскім конкурсе нацыянальных кінапраектаў Міністэрства культуры як нацыянальны. Але ў выніку на кінастудыі «Беларусьфільм» стужка ствараецца як дэбютны праект. Прычым 70% бюджэту фільма складаюць дзяржаўныя грошы, а 30% — унёсак кінастудыі. Яе дырэктар Алег Сільвановіч з'яўляецца прадзюсарам стужкі.

Мы з фотакарэспандэнтам правялі ў павільёне «Беларусьфільма» бадай цэлы дзень. Атрымлівалі задавальненне ад здымачнага працэсу. Сапраўды, кіназдымкі — гэта нешта неверагоднае. Гучыць, вядома, не арыгінальна, але так ёсць. Атмасфера на «Белых росах-2» пануе хоць і крэатыўна-сямейная, але ўсё адно, як на любых здымках, набліжана да надзвычайнай. Выпадковы чалавек можа і спалохацца: маўляў, што гэта за людзі ў камуфляжнай вопратцы, з рацыямі, гучнагаварыцелямі і кучай назіральнай тэхнікі?


Вось так мэтанакіравана рэжысёр Аляксандра БУТАР працуе з вядомым артыстам Віктарам МАНАЕВЫМ.


Яўгенія ЖУКОВІЧ ужываецца ў вобраз Паліны — малюе партрэт каханага пяском.

Насамрэч, гэта нармальна. Сёння, вядома, ніхто ўжо не верыць у Дзеда Мароза і хаця б прыблізна ўсведамляе, што кіно — гэта вялікая ілюзія. Але як цікава назіраць, калі здымаецца кранальная сцэна, напрыклад, у якой гераіня Яўгеніі Жуковіч Паліна малюе партрэт героя Паўла Харланчука Бодзі пяском на падлозе ў сваёй хаце, а вакол мітусяцца людзі, якія не трапляюць у кадр. Яны п'юць каву, каб сагрэцца, вырашаюць нейкія тэхнічныя пытанні, жартуюць, крычаць, посцяць фоткі ў «інстаграм», і наогул ім і справы нібыта няма да ўнутранай трагедыі гераіні. Вось яна — магія кіно.


Працоўны момант. Аператар Алег ГІРЭЛЬ, рэжысёр Аляксандра БУТАР і акцёр Віктар МАНАЕЎ (справа налева) у працэсе абмеркавання.

Увогуле, на здымках фільма пра традыцыйныя каштоўнасці — сям'ю, зямлю, сонца ды неба — пануе атмасфера любові.

— Ведаеце, акцёры, яны як дзеці, — распавядае **рэжысёр Аляксандра БУТАР**. — Ім заўжды хочацца, каб іх пашкадавалі, зразумелі, суцешылі. Я гэтым і займаюся, таму што вельмі люблю з імі працаваць.

Нават такія самавітыя майстры, як літовец Юозас Будрайціс і беларус Віктар Манаеў, добра вядомыя сваімі дасягненнямі перад тэатрам і кіно, у адзін голас сцвярджаюць, што такой пяшчотнай атмасферы на здымках мужчына-рэжысёр стварыць бы не здолеў.

У сталіцы здымкі працягнуцца да 27 верасня. І акрамя павільёнаў кінастудыі, здымачная група пабывае на кватэры, у клубе, у аэрапорце і офісе. Цікава, што ў начным клубе будуць здымаць не толькі эпізод, дзе галоўныя героі Бодзя і Русачэнка адзначаюць сваю першую перамогу на шляху да фінансавага поспеху, але музычны кліп грута «J:mors». Справа ў тым, што песня Уладзіміра Пугача «Дажджамі» стане саўндтрэкам да фільма, а кліп, у якім Пугач, Харланчук, Жбанаў і Мярзлікін спяваюць гэтую песню, — своеасаблівай прома-акцыяй да прэм'еры стужкі.

Застаецца толькі спадзявацца, што фільм сапраўды атрымаецца добрым і светлым і гледачы не забудуць пра яго акурат пасля паказаў у кінатэатрах абласных цэнтраў нашай радзімы. Бо размовы пра тое, што давер да беларускага кіно трэба вяртаць, ідуць даўно.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ. Фота Надзеі БУЖАН.**

*Падрабязны фотарэпартаж са здымак шукайце на сайце газеты.*